УДК 94(438+476)(045)

***Цымбал Аляксандр***
*Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь*

# БЕЛАРУСЬ У ПАЛІТЫЦЫ ПОЛЬСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ Ў 1918-1921 ГГ. : ПОЛЬСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ[2]

Артыкул прысвечаны вызначэнню асноўных дыскусійных праблем якія ўзнымаюцца ў польскай гістарыяграфіі польскай палітыкі адносна Беларусі ў 1918-1921 гг. Сярод іх называюцца: канфліктагеннасці ідэі адраджэння Рэчы Паспалітай ў ХХ ст., пачатак вайны і кваліфікацыі прысутнасці польскіх войск на беларускіх землях, нацыянальнай структуры насельніцтва, польскай “цывілізацыйнай місіі” на ўсходзе, вобраза “чужых” у гістарычным наратыве, канфесійнай палітыцы і міжнародная сітуацыя станаўлення польскай і беларускай дзяржаўнасці.

***Ключавыя словы: Беларусь, польская гістарыяграфія, польска-савецкая вайна, польская “цывілізацыйная місія”***

Гістарыяграфія польска-савецкай вайны, польскай нацыянальнай палітыкі налічвае не адзін дзесятак выданняў. Прапанаваны артыкул не мае на мэце ахапіць усю праблематыку польскай палітыкі адносна Беларусі і не прэтэндуе на вычарпальны аналіз гістарыяграфіі, а толькі паспрабуе наблізіць да вызначэння спрэчных пытанняў беларуска-польскай гісторыі перыяду 1918-1921 гг.

Сучасная польская гістарыяграфія надае вялікую ўвагу пытанням усходняй граніцы, узаемаадносінам з нацыянальнымі рухамі. Польскі гістарычны наратыў падзей аднаўлення дзяржаўнасці і польска-савецкай вайны прадстаўляе падзеі як перамогу палякаў, якая спыніла экспарт сацыялістычнай рэвалюцыі ў Еўропу, а таксама дае выключна негатыўную ацэнку бальшавіцкай палітыкі адносна Беларусі ў адрозненне ад станоўчых поглядаў на дзейнасць Ю. Пілсудскага.

У XIX – пачатку ХХ ст. палякі і беларусы ўвайшлі будучы часткай імперый. Нацыянальныя рухі хоць і развіваліся з рознай «гістарычнай хуткасцю», але інтэлектуальныя эліты народаў сфарму-

[2] Исследование выполнено при финансовой поддержке БРФФИ и РФФИ в рамках научного проекта Г20Р-011 «Современное зарубежное историческое белорусоведение: эволюция методологических подходов и оценок»

лявалі праграмы нацыянальнага вызвалення і самавызначэння, падышлі да стварэння ўласнай дзяржаўнасці. Праблема палягала ў тым, што польскія палітыкі, зыходзячы з «гістарычнага права», бачылі будучую Польшчу выключна ў граніцах Рэчы Паспалітай 1772 г. Дыскусійным пытаннем застаецца наколькі ідэі адбудовы «гістарычнай» Рэчы Паспалітай, як галоўнай ідэі ўсяго польскага нацыянальнага руху з канца XVIII ст. адпавядалі рэаліям XX ст. Вернасць гістарычнай традыцыі аднаўлення шляхецкай дзяржаўнасці стала асновай для нацыянальных міфаў, якія хоць і спрыялі росту польскага патрыятызму, але супярэчылі новым рэаліям і непазбежна прыводзілі да сутыкнення з суседзямі.

Пытанне пачатку польска-савецкай вайны і кваліфікацыі прысутнасці польскіх войскаў на тэрыторыі Беларусі выклікае розныя ацэнкі гісторыкаў. Для польскай гістарыяграфіі характэрна сцвярджэнне аб планах бальшавікоў паходу на Захад з мэтай распальвання сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі. Але не ўлічваецца, наколькі гэта было магчыма ва ўмовах вострай унутранай барацьбы, нестабільнасці ўлады бальшавікоў, грамадзянскай вайны і ўсведамлення факту, што заканчэнне Першай сусветнай вайны ў лістападзе 1918 г. не прывяло да рэвалюцыі ў Еўропе. Магчымасць польскай адказнасці за развязванне вайны абсалютна непрымальна ў сучасным польскім грамадска-навуковым дыскурсе, пра што сведчаць і напады на навукоўцаў, якія сцвярджаюць аб польскай віне ў пачатку польска-савецкай вайны [1].

Пілсудскі Ю. мэты вайны Польшчы на ўсходзе вызначыў яшчэ ў 1918 г. і пачынаў экспансію не маючы саюзнікаў на былых усходніх землях Рэчы Паспалітай. Бальшавікі, у сваю чаргу, такіх саюзнікаў мелі і лічылі, што знаходзяцца на сваёй тэрыторыі. 8 лютага 1919 г. з дапамогай Францыі Ю. Пілсудскі заключыў з германскім камандаваннем у Беларусі дамову аб беспярашкодным пропуску праз нямецкія пазіцыі польскіх войскаў для прамога сутыкнення з Чырвонай арміяй. У выніку пачалася вайна, якая праходзіла на тэрыторыях, якія былі ні польскія, ні рускія. У польскай гістарычнай навуцы можна сустрэць думку аб адсутнасці падстаў для кваліфікацыі прысутнасці польскіх войскаў на гэтай тэрыторыі, як акупацыі, што аднак супярэчыць вызначэнню акупацыі згодна 42 арт. Гаагскай канвенцыі 1907 г. : «Тэрыторыя лічыцца акупаванай, калі яна фактычна знаходзіцца пад уладай варожай арміі» [2]. Менавіта як акупацыю разглядалі палітыку Польшчы і беларускія дзеячы. У 1920 г. А. Луцкевіч выдаў працу пад адпаведнай назвай – «Польская акупацыя Беларусі» [3].

Адной з ключавых праблем беларуска-польскіх узаемаадносін у гэтым кантэксце выступае нацыянальная структура заходнебеларуска-

га рэгіёна. Можна сцвярджаць, што нацыянальнае пытанне было галоўным ва ўсходняй палітыцы польскіх улад. Перапісы насельніцтва былі адным з інструментаў вырашэння гэтага пытання. Так перапіс 1919 г. праведзены на тэрыторыях падкантрольных Цывільнай управе ўсходніх зямель (далей ЦУУЗ) спрыяў не столькі вывучэнню, колькі хутчэй канструяванню нацыянальнай структуры заходнебеларускага рэгіёну ў патрэбным польскім уладам кірунку для дэманстрацыі дамінацыі польскага элементу і абгрунтавання «польскіх правоў» на гэтыя землі. Кіраўнік ЦУУЗ, адзін з першых хто пакінуў заўвагі аб перапісу – Е. Асмалоўскі, сцвярджаў, што галоўнай мэтай перапісу было прадставіць мясцовае насельніцтва як несвядомую, у нацыянальным сэнсе, масу, за выключэннем палякаў. «Палякі маглі б кіраваць краінай насуперак інтарэсам беларусаў» – пісаў Асмалоўскі [4, с. 93]. Такое бачанне беларускіх зямель было ў Ю. Пілсудскага і адлюстроўвала погляды амаль усяго польскага грамадства. Працягнулі «традыцыю» маніпуляцый і перапісы 1921 і 1931 гг., пра якія Э. Штурм дэ Штрэм (у 1929-1939 гг. кіраўнік Галоўнай статыстычнай ўправы) сцвярджаў, што абодва былі сфальсіфікаваны [5, с. 229-230].

Польскія палітыкі, а таксама землеўладальнікі на беларускіх землях, прымяншалі, а часта ігнаравалі беларускі нацыянальны рух і беларускае насельніцтва. Адбывалася дэсуб’ектывізацыя беларусаў. Беларускі рух ацэньваўся праз прызму рэалізацыі ўласных мэт. Польскія дзеячы непрыязна ставіліся да беларускага адраджэння, не прызнавалі спроб беларускага дзяржаўнага самавызначэння, надалей называючы яе жыхароў паняццем «этнаграфічнай масы». Як пісаў В. Лютаслаўскі, беларусы – «насельніцтва, пераходнае паміж палякамі і маскавітамі». Аўтар выказваў думкі аб нацыянальнай неразвітасці беларусаў, што абгрунтоўвала арганічнасць далучэння беларускіх земляў да Польшчы. Ідэя падмацоўвалася думкамі аб цывілізатарскай місіі польскага насельніцтва на ўсходзе Еўропы [6, С. 4-5]. Для 1919 г. падобныя ідэі не дзіўныя, але і сёння ў польскім навуковым дыскурсе можна знайсці падобныя ідэі “цывілізатарскай місіі” польскіх асаднікаў ці ўлад на заходнебеларускіх землях [7]. У падобным гістарыяграфічным дыскурсе беларусы і надалей выступаюць не як суб’ект гісторыі, а як аб’ект знешняга ўздзеяння.

Дыскусійным застаецца пытанне стаўлення да беларусаў польскіх палітычных груповак і іх лідараў. Праблема, як разумеў беларускае пытанне і шляхі яго вырашэння Ю. Пілсудскі ўяўляецца вельмі неадназначнай. У савецкай і польскай марксісцкай гістарыяграфіі найбольш распаўсюджаным з’яўляўся погляд, што Пілсудскі паступова схіляўся на карысць правых, набліжаючыся да Дмоўскага і На-

цыянальнага камітэту ў Парыжу. Сучасная польская гістарыяграфія хутчэй апалагетычна падыходзіць да яго дзейнасці. Можна сцвярджаць, што агульна прынятым у польскай гістарычнай навуцы з'яўляецца погляд, што польскі экспансіянізм на усходзе быў непазбежным этапам развіцця нацыі і адыграў у свой час станоўчую ролю. Сцвярджаецца, што маршал безагаворачна падтрымліваў ідэю федэралізацыі, і лічыцца, што нават Рыжскі мір быў паражэннем Пілсудскага, бо перамаглі прыхільнікі інкарпарацыі [8, с. 27]. У той жа час аднак у Пілсудскага і Дмоўскага былі выказванні, якія фактычна адмаўлялі беларусам у нацыянальным існаванні. Польскія палітычныя групоўкі займалі адносна дзеянняў беларускіх палітыкаў непрыязную пазіцыю, таму пытаннем застаецца наколькі рэальнай была федэралісцкая канцэпцыя для беларусаў ці на практыцы яна ўяўляла сабой ідэалагічнае прыкрыццё экспансіянісцкіх планаў і сродак расколу беларускага руху.

Застаецца актуальнай праблема «алігархічных» матываў польскай усходняй палітыкі. Як адзначалася ў «Krótki zarys zagadnienia białoruskiego», пад уплывам камуністычнай прапаганды, якая ўмела выкарыстоўвала ганебнае становішча сялян, былыя крыўды і зямельны голад, каб пасеяць нянавісць паміж вёскай і «панамі», у Беларусі пачаліся напады на польскія двары, рабункі і забойства польскага насельніцтва [9, с. 79]. Польскія памешчыкі займаючы пасады ў польскіх памешчыцкіх арганізацыях на тэрыторыі Беларусі не звярталі асаблівай увагі на канцэпцыі ўсходняй палітыкі, праводзячы лінію на далучэнне беларускіх зямель да Польшчы. Актуальнай застаецца праблема супярэчнасці інтарэсаў польскага буйнога землеўладання і агульнанацыянальных ці агульнадзяржаўных інтарэсаў, што вяло да няўстойлівасці польскай дзяржавы і міжнацыянальным канфліктам, асабліва сітуацыі ва ўсходніх ваяводствах Польшчы.

Стэрэатыпнай рысай для польскай гістарыяграфіі стаў вобраз «чужых», пагрозе тых, хто не ўпісваўся ў «крэсовую» ідылію і выступаў як здрайца і разбуральны элемент – гэта камуністы, яўрэі. Нацыянальны беларускі рух у міжваеннай Польшчы у гэтым кантэксце разглядаецца як несамастойны і інспіраваны Расіяй [10]. Ідэя гэта была закладзена яшчэ ў згаданым выданні «Krótki zarys zagadnienia białoruskiego» і некрытычна перанята ў сучаснай польскай гістарыяграфіяй. Такі падыход не дапушчаў магчымасці польскай адказнасці за канфлікты.

Да нацыянальнага і аграрнага пытання дадавалася канфесійная праблематыка. Польскія ўлады наступалі і на рэлігійныя пачуцці беларусаў, пачаўшы акцыю рэвіндыкацыі і адбірання праваслаўных

храмаў. Па пытанні адносін польскіх улад да праваслаўя ў польскай гістарыяграфіі ў канцы 1980-х – пачатку 2000 гг. склаўся пэўны кансэнсус у ацэнках дзякуючы працам М. Папежынькай-Турек [11] і А. Мірановіча [12], якія крытычна разглядалі палітыку ўлад да царквы, характарызуючы як інструментальную, накіраваную на нацыянальную асіміляцыю і адмову ад істотных для беларусаў каштоўнасцей: мовы, традыцый, веравызнання і дзяржаватворчых памкненняў. Але ў апошнія гады паўстала новая апалагетычная інтэрпрэтацыя праблемы. У працы В. Калбука [13] сцвярджаецца, што рэвіндыкацыю, разбурэнні цэркваў, навязванне праваслаўнай царкве прававых нормаў згодных з польскімі дзяржаўнымі інтарэсамі нельга называць пераследам праваслаўя. Аўтар сцвярджае, што асновай польскай палітыкі адносна праваслаўных вернікаў не з'яўлялася імкненне да ліквідацыі канфесіі, а каталіцкая царква, толькі шукала жадаючых сярод праваслаўных да пераходу ў каталіцызм. Калі і здараліся выпадкі, якія парушалі добраахвотны прынцып, то яны былі спарадычныя і выпадковыя [13, с. с. 166-167]. Дадзены падыход рэанімуе міфалагему «аплоту хрысціянства» і неабходнасці яго абароны перад навалай з усходу.

Даследаванне міжнароднага кантэксту станаўлення польскай і беларускай дзяржаўнасці, спроб разыграць беларускую карту на сваю карысць польскім і расійскім бокам падводзяць нас да праблемы, чаму бальшавікі фактычна перайгралі ў гэтым сэнсе палякаў. Нават паланафільскія настроі ў Беларусі (напрыклад група Алексюка – Тарашкевіча) доўга не праіснавалі. «Krótki zarys zagadnienia białoruskiego» вінаваціць у гэтым менавіта няўмелыя дзеянні саміх польскіх улад. Гучалі завярэнні ў павазе да нацыянальных пачуццяў беларусаў, на практыцы палякі паводзілі сябе як у заваяванай краіне і ў выніку не выпрацавалі паслядоўнай нацыянальнай палітыкі [9, с. 85], пагасіўшы нават першую сімпатыю, якая ўзнікла пасля адозвы «Да жыхароў былога Вялікага Княства Літоўскага», якую 22 красавіка 1919 г. выдаў Ю. Пілсудскі.

Некаторыя гісторыкі наадварот усю віну перакладаюць на беларускі рух. Так Р. Война сцвярджаў, што самі беларусы не былі ў стане і не жадалі выкарыстаць шансы, якія давала барацьба Польшчы супраць бальшавіцкай Расіі, таму і сталі аб'ектам у спрэчках мацнейшых [14, с. 32-43].

Новыя інтэрпрэтацыі набывае роля заходніх краін у вызначэнні польскай усходняй граніцы. У савецкай гістарыяграфічнай традыцыі роля краін Антанты ацэньвалася негатыўна, нібыта яны садзейнічалі польскім захопам, бо былі зацікаўлены ў стварэнні «санітарнага кар-

дону» ад бальшавіцкай пагрозы. Сёння ў польская гістарыяграфіі прапануецца погляд, што Вялікабрытанія ў 1920 г. здрадзіла Польшчу, прапануючы ноту Дж. Керзона падчас наступлення бальшавікоў на Варшаву каб супакоіць іх апетыты аддавала бальшавіцкай Расіі частку Ўсходняй Еўропы. Польскі гісторык А.Новак называе гэты акт першай ў гісторыі спробай палітыкі «замірэння» агрэсара [15].

Такім чынам, на сённяшні дзень гістарыяграфія праблемы нацыянальнай і ўсходняй палітыкі польскіх улад хоць і зрабіла вялікі крок наперад, аднак захавала шматлікія стэрэатыпныя ўяўленні. У польскай гістарыяграфіі захоўваецца дыскурс аб «гістарычных правах», «цывілізацыйнай місіі» ў рамках «крэсовага» падыходу, які выклікае неадназначнасць ацэнак і ў самой Польшчы. Адносна паняцця «крэсы» напрыканцы хацелася б прывесці словы прафесара В. Слешыньскага: «паняцце «крэсы» мае асіметрычны характар і не з'яўляецца «крэсамі» для грамадства, якое жыве з аднаго з бакоў. «Крэсы» маюць выразную і моцную экспансіўную і наступальную канатацыю» [16, с. 9].


1. Skandaliczny wpis Hartmana dotyczący wojny z bolszewikami. „To Polacy napadli na Rosję» // Polonia christiana [Электронны рэсурс]. – 2020. Рэжым доступу : https://www.pch24.pl/skandaliczny-wpis-hartmana-dotyczacy-wojny-z-bolszewikami--to-polacy-napadli-na-rosje,70196,i.html. – Дата доступу: 01.11.2020.

2. Annex to the Convention: Regulations respecting the laws and customs of war on land – Section III : Military authority over the territory of the hostile state – Regulations: Art. 42. // International Committee of the Red Cross [Электронны рэсурс]. – 2020. Рэжым доступу : https://ihl-databases.icrc.org/applic/ihl/ihl.nsf/Article.xsp?action=openDocument&documentId=01D426B0086089BEC12563CD00516887. – Дата доступу: 01.11.2020.

3. Łuckiewicz, A. Polska okupacja na Białorusi / A. Łuckiewicz. – Wilno : Drukarnia Kooperacyjnego Stowarzyszenia Druk, 1920. – 19 s.

4. Гамулка, К. Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняў (1918 – 1922) / К. Гамулка; пераклад з польскай мовы. – Вільня : 2008. – 256 с.

5. Szturm de Sztrem, E. Prawdziwa statystyka / E.Szturm de Sztrem // Spisy ludnośći Rzeczypospolitej Polskiej 1921-2002. Wybór pism demografów / pod.red. Z. Strzeleckiego i T.Toczyńskiego. – Warszawa, 2002. – S. 229 – 231.

6. Lutosławski, W. Lithuania and White Ruthenia / W. Lutosławski . – Paris : Imprimerie Levé, 1919. – 36 p.

7. Главінскі, Т. Забыты гарнізон. Аддзелы Корпуса аховы памежжа ў Івянцы ў 1924–1939 гадах / Т. Главінскі; пераклад з польскай мовы Алеся Пілецкага. – Выд. 2-е. – Смаленск : Інбелкульт, 2015. – 142 с.

8. Balcerak, W. Sprawa białoruska a polityka odradzającej się Rzecztpospolitej / W Balcerak // Polska –Białoruś (1918-1945). Zbiór studiów i materiałów / Pod red. W. Balceraka. – Warszawa : Instytut Historii PAN. Stowarzyszenie Wspołpracy Polska-Wschod. Stowarzyszenie Polska-Bialoruś, 1994. – S. 6-31.

9. Krótki zarys zagadnienia białoruskiego, Sztab Generalny Oddział II . – Warszawa , 1928. – 414 s.
10. Śleszyński, W. Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej / W. Śleszyński . – Warszawa : Instytut Studiów Politycznych PAN : «Rytm», 2007. – 400 s.
11. Papierzyńska-Turek, M. Między tradycją a rzeczywistością. Państwo wobec prawosławia w 1918–1939 / M. Papierzyńska-Turek. – Warszawa : PWN, 1989. – 482 s.
12. Mironowicz, A. Kościół prawosławny w Polsce / A. Mironowicz. – Białystok : Zakł. Poligraficzny OFFSET-PRINT, 2006. – 917 s.
13. Kołbuk, W. Cerkiew prawosławna w Polsce międzywojennej / W. Kołbuk. – Lublin : KUL, 2013. – 244 s.
14. Wojna, R. Wojna domowa w Rosji a Białoruś / R. Wojna // Polska –Białoruś (1918-1945). Zbiór studiów i materiałów / Pod red. W. Balceraka. – Warszawa : Instytut Historii PAN. Stowarzyszenie Współpracy Polska-Wschod. Stowarzyszenie Polska-Bialoruś, 1994. – S. 32- 43.
15. Nowak, A. Pierwsza zdrada Zachodu. 1920 – zapomniany appeasement / A. Nowak. – Warszawa : Wydawnictwo Literackie, 2015. – 606 s.
16. Śleszyński, W. Świat pogranicza : stosunki społeczno-polityczne na pograniczu polsko-litewsko-białoruskim w XX i XXI wieku : wykłady. Cz. 1, II Rzeczypospolita (1919-1939), dwa pierwsze lata wojny (1939-1941) / W. Śleszyński. – Białystok : Instytut Historii Uniwersytetu w Białymstoku : Wydawnictwo Prymat Mariusz Śliwowski, 2009. – 216 s.

## BELARUS IN THE POLICY OF THE POLISH STATE IN 1918-1921: POLISH HISTORIOGRAPHY

***Tsimbal Alexander***
*Minsk State Linguistic University, Minsk, Belarus, aleksander.g.t@gmail.com*

The article is devoted to the definition of the main debatable issues raised in the Polish historiography of Polish policy towards Belarus in 1918-1921. Among them are: the conflictogenicity of the idea of revival of the Rzecz Pospolita in the XX century, the beginning of the war and the qualification of the presence of Polish troops in Belarus, the national structure of population, the Polish "civilization mission" in the east, the image of "Others" in historical narrative, confessional policy and international context of formation of Polish and Belarusian statehood.

***Keywords: Belarus, Polish historiography, Polish-Soviet war, Polish "civilization mission".***